# РУПЛІВЫЯ ГАСПАДАРЫ ЛЯСНОГА БАГАЦЦЯ

**Глускі раён багаты на лясныя рэсурсы. Спецыялісты мясцовага лясгаса на працягу многіх гадоў беражліва ставяцца да лесу і разумна выкарыстоўваюць кожны яго гектар.**



Дырэктар Глускага лясгаса Сяргей Віктаравіч МАКСІМОВІЧ.

## З СУР'ЁЗНЫМІ ЭКСПАРТНЫМІ АМБІЦЫЯМІ

Дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Глускі лясгас» размешчана ў паўднёва-заходняй частцы Магілёўскай вобласці на тэрыторыі Глускага адміністрацыйнага раёна.

Працягласць тэрыторыі лясгаса з поўначы на поўдзень — 55 км, з захаду на ўсход — 40 км. Агульная плошча складае больш за 75 тысяч га, у тым ліку пакрытыя лесам — больш за 68 тысяч га. У яго склад уваходзяць 8 лясніцтваў: Глускае, Гарадокскае, Дакольскае, Завалочыцкае, Зелянковіцкае, Каткаўскае, Кіраўскае і Слаўкавіцкае.

Глускі лясгас быў створаны ў 1936 годзе на базе лясоў Глускага леспрамгаса. Падпарадкоўваўся лясгас Палескаму тэрытарыяльнаму ўпраўленню лесаахове і лесанасаджэнняў. З тых часоў шмат што змянілася, але асноўныя задачы па захаванні, ахове і ўзнаўленні лесу застаюцца ранейшымі. Акрамя гэтага, тут асаблівую ўвагу надаюць прадастаўленню турыстычных і паляўнічых паслуг — на тэрыторыі лясной гаспадаркі паспяхова ўтрымліваюцца паляўнічыя ўгоддзі і круглы год арганізуюцца розныя віды адпачынку. Летась у паляўнічым комплексе лясгаса пабудавалі сучасную лазню, а таксама абсталявалі яго двума барбекю (зімняга і летняга тыпу). Сюды можна прыязджаць вялікай кампаніяй і атрымаць асалоду ад адпачынку на прыродзе круглы год.

Асноўнай прадукцыяй лясгаса была і застаецца нарыхтоўка і перапрацоўка лесу. У складзе лясгаса ёсць цэх дрэваапрацоўкі. Прадукцыя вельмі якасная, і асноўны яе аб'ём — 80% — ідзе на экспарт. Пастаўкі галоўным чынам накіроўваюцца ў Літву. Таксама драўніна экспартуецца ў Румынію, Польшчу, Галандыю, Бельгію, Германію, Кітай. Пастаўляюць і балансавую драўніну розных парод, дранку і пілавінне. У цэху перапрацоўкі вырабляюць акораную, ацыліндраваную драўніну і піламатэрыялы. Прапануюць і паганажныя вырабы, якія карыстаюцца добрым попытам на ўнутраным рынку. Таксама беларускія прадпрыемствы закупляюць шалёўку, блок-хаўс, імітацыю бруса, плінтус. Па індывідуальных заказах і дызайне майстры лясгаса гатовыя зрабіць альтанкі, садовую мэблю, дзверы, вокны. Кошт альтанкі пачынаецца ад 4 млн рублёў, самая дарагая распрацоўка абышлася заказчыкам у 12 млн.

«Сёлета балансавую драўніну з хвоі пачалі пастаўляць у Узбекістан. На ўнутраным рынку больш за ўсё запатрабавана тэхсыравіна хвойных парод, балансавая драўніна», — адзначыў дырэктар Глускага лясгаса Сяргей Максімовіч.

Тут беражліва ставяцца да ляснога масіву і сочаць за тым, каб лес пастаянна павялічваўся і быў пад аховай. У планах на 2016 год стварыць 200 га лясных культур. Для гэтага побач з галоўным офісам Глускага лясгаса знаходзіцца гадавальніцкая гаспадарка. Таксама для аховы лясоў ад пажараў ёсць дзве пажарна-хімічныя станцыі. Пункты супрацьпажарнага інвентару прысутнічаюць пры кожным лясніцтве.

## НЕЎЗАБАВЕ ЗОЙМУЦЦА І ПЕЛЕТАМІ

Як расказаў Сяргей Максімовіч, на прадпрыемстве замацоўваюцца практычна ўсе маладыя спецыялісты. Тых, каму гэта неабходна, забяспечваюць здымным жыллём. Моладзь атрымлівае максімальныя надбаўкі і мае добры заробак. А гэта адзін з асноўных паказчыкаў прадпрыемства, якое сёння працуе эфектыўна. Таксама тут пастаянна думаюць і пра тое, якім чынам развівацца. Сёлета ў лясгасе плануюць мадэрнізацыю старой лесанарыхтоўчай тэхнікі, а таксама набыццё новай. Акрамя гэтага, лясгас займаецца распрацоўкай праектнай дакументацыі па будаўніцтве пелетнага завода — перспектыўнага праекта, стварэнне якога прынясе немалы прыбытак для ўсяго раёна. Тут будуць перапрацоўвацца пілавінне, адходы дрэваапрацоўкі, і з іх стварацца драўняныя пелеты. Да справы падыходзяць з усёй адказнасцю — вывучаюць работу аналагічных прадпрыемстваў, якія ўжо працуюць у Польшчы і Расіі, кансультуюцца з замежнымі калегамі і пераймаюць вопыт.

«Мы чакаем, што на рынку пелеты будуць запатрабаваныя. Налета мы плануем запуск гэтага завода на базе нашага лясгаса», — растлумачыў Сяргей Максімовіч.

У гэтым годзе таксама хочуць павялічыць долю экспартных паставак, і гэта не дзіўна, бо прадукцыяй Глускага лясгаса цікавяцца нават у Англіі.

Лясны масіў раёна моцна пацярпеў у час зімовых цыклонаў. Эксперты з лясгаса ацанілі, што ў асноўным стыхія пашкодзіла насаджэнні ва ўзросце 40-60 гадоў. Спецыялісты прадпрыемства ўсё яшчэ працягваюць працу над аднаўленнем і ліквідацыяй наступстваў непагадзі. У гэтым ім дапамагаюць і іншыя прадпрыемствы.

У 2012 годзе ў Глускім лясгасе таксама пачалі нарыхтоўку драўніны з выкарыстаннем шматаперацыйнай тэхнікі. Сёння прадпрыемства з'яўляецца адным з лідараў у краіне па зборы драўніны з дапамогай харвестараў.



Асноўная прадукцыя лясгаса — нарыхтоўка і перапрацоўка лесу.



Начальнік гадавальніка Юлія ПРЫБЫШ і інжынер па лесааднаўленні і меліярацыі Сяргей ДЗЯТЛАЎ дэманструюць туі ў краме дэкаратыўна-пасадачнага матэрыялу.

**Карысны адрас:**
213879, Магілёўская вобласць, г.п. Глуск,
вул. Калінкоўская, 28
Тэл. прыёмнай 802230 41205
УНП 700100636

# УНІКАЛЬНЫ ВОПЫТ



**Адным з асноўных прадпрыемстваў Глускага раёна з'яўляецца ААТ «Глуская Зара». Тут на працягу многіх гадоў эфектыўна займаюцца раслінаводствам, жывёлагадоўляй і вытворчасцю малака**

## СКЛАДНІК ПОСПЕХУ

Калгас быў арганізаваны ў 1929 годзе. У 2007-м адбылася рэарганізацыя гаспадаркі, у выніку якой да яе быў далучаны калгас імя Калініна. 30 лістапада мінулага года калгас «Зара» пераўтварыўся ў адкрытае акцыянернае таварыства «Глуская Зара». Яно размешчана ў паўднёва-ўсходняй частцы Глускага раёна і мяжуе з Акцябрскім раёнам Гомельскай вобласці ў 23 км ад гарадскога пасёлка Глуск і 10 км ад гарадскога пасёлка Акцябрскі. У гаспадарцы сёння працуе 216 чалавек. Дарэчы, усім супрацоўнікам, хто мае патрэбу ў жыллі, яго прадастаўляюць.

Асноўны від дзейнасці таварыства — вытворчасць малака і мяса, а таксама вырошчванне збожжавых культур і рапсу. Як распавёў дырэктар ААТ «Глуская Зара» Леанід Буры, у 2015 годзе таварыства атрымала больш за 32 млрд рублёў выручкі ад рэалізацыі прадукцыі.

Машынна-трактарны парк СВК складаецца з 24 трактароў розных марак, 22 грузавых і легкавых аўтамабіляў, 6 збожжаўборачных і 4 кормаўборачных камбайнаў. Ужо другі год на трактарах выкарыстоўваюць сістэмы GPS-навігацыі для кантролю і ўліку расходу паліва, якія даказалі сваю эфектыўнасць. У гаспадарцы ёсць зернесушыльны комплекс, 2 тыпавыя майстэрні па рамонце тэхнікі, пункт тэхнічнага абслугоўвання, фуражны склад і склад для насення, сховішчы для сена, сенажу і сіласу.



Тамара БАРЫШНІКАВА, загадчыца фермы «Слабодка», адказна сочыць за здароўем цялятаў.

## ПРАЦУЮЦЬ ДЛЯ ГУРМАНАЎ

Намеснік дырэктара па ідэалагічнай працы Наталля Акуліч расказала, што агульная зямельная плошча «Глускай Зары» складае 10737 га. З іх на сельгасугоддзі прыпадае 7762 га — 3664 га ворыва, 3348 га сенажацяў і 750 га пашы. Летась валавы збор збожжа склаў 2728 тон. Валавая вытворчасць рапсу — 106 тон.

Аднак асноўны акцэнт у працы акцыянернага таварыства ўсё ж на жывёлагадоўлі. Галоўнай галіной тут з'яўляецца гадаванне буйной рагатай жывёлы (БРЖ) з удзельнай вагой у структуры таварнай прадукцыі 46,1%. На малочную галіну прыпадае 39,9%. У складзе гаспадаркі: малочнатаварны комплекс на 700 галоў, 2 малочнатаварныя фермы і жывёлагадоўчы комплекс па адкорме БРЖ. Дарэчы, у пачатку 2016 года яе пагалоўе склала 3066 галоў, у тым ліку 1137 галоў дойнага статку. У комплексе таксама жывуць «палявыя зубры» — быкі-лімузіны. Менавіта з мяса тутэйшага статка вырабляюць беларускую мармуровую ялавічыну, якую вязуць на Бабруйскі і Магілёўскі мясакамбінаты. Мясцовае малако выкарыстоўваюць для вырабу прадукцыі на такім вядомым беларускім прадпрыемстве, як «Бабулін гладыш».

У верасні 2009 года ў эксплуатацыю ўведзены малочнатаварны комплекс на 700 галоў у аграгарадку Бярозаўка. Яго вытворчая зона складаецца з двух кароўнікаў з малочным блокам з сучасным даільным абсталяваннем, цэхам для сухастойных кароў, цялятніка, радзільнага аддзялення і двух прафілакторыяў для маладняку. На комплексе выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі круглагадовага беспрывязнага стойлавага ўтрымання, даення, паўнавартаснага збалансаванага кармлення. Пастаянна вядзецца селекцыйна-племянная работа па стварэнні жывёл з высокім генетычным патэнцыялам.

Пра сваіх супрацоўнікаў у акцыянерным таварыстве заўсёды клапаціліся. Для жывёлаводаў абсталяваны пакой адпачынку, які не толькі адпавядае санітарным нормам, але вылучаецца асаблівым камфортам, што адзначана абласным прафсаюзным камітэтам у аглядзе-конкурсе на найлепшую працу па стварэнні ўмоў для адпачынку.

У верасні 2014 года ўведзена першая чарга малочнатаварнай фермы «Слабодка». За 2015 год надоі фермы склалі 989 тон малака, таварнасць — 90%, сярэдні ўдой ад 1 каровы — 4517 кг. Па ўсіх каналах збыту ў 2015 годзе рэалізавана 3210,3 тоны малака, што на 92,2 тоны больш за ўзровень 2014 года.

**Каштоўны адрас:**
213882, Магілёўская вобласць,
Глускі раён,
аграгарадок Катка,
прыёмная 802230 48813
УНП 700099606

**Матэрыялы падрыхтавалі Ілья КРЫЖЭВІЧ, Святлана СУШКО, Вольга ГЕЦЭВІЧ. Фота Надзеі БУЖАН.**